Спорт-тайм

Шчаслівая вада для Шкурдай

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра поспехі маладой беларускай плыўчыхі і іншыя найбольш цікавыя падзеі выхадных.

1. ***Настасся Шкурдай заваявала два залатыя медалі на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па плаванні ў Казані.*** Беларуска ўпэўнена перамагла ў вырашальным заплыве на 50 метраў батэрфляем — 26,23 секунды, а таксама стала найлепшай на дыстанцыі 100 метраў батэрфляем і заняла трэцяе месца на 200 метраў на спіне.

Нагадаем, два гады таму ў ізраільскай Нетаніі на аналагічным турніры беларуска таксама перамагла на дыстанцыі 50 метраў батэрфляем. Наступным буйным стартам для Настассі ў гэтым сезоне стане дарослы чэмпіянат свету ў паўднёвакарэйскім Кванджу, дзе Шкурдай плануе выступіць у эстафетах.

2. ***Мужчынская зборная Беларусі па валейболе перамагла Турцыю — 3:1 і заняла трэцяе месца ў кваліфікацыі Лігі нацый.*** Нагадаем, раней нашы спартсмены абыгралі Егіпет (3:2), саступілі Кубе (1:3) і Славеніі (1:3). Перамогу ў турніры святкавалі валейбалісты Славеніі, якія ў вырашальным матчы былі мацнейшыя за Кубу, — 3:0.

Турнір стаў важным этапам падрыхтоўкі да старту ў фінальнай стадыі чэмпіянату Еўропы, які пройдзе з 12 да 29 верасня. Беларускія валейбалісты згуляюць у групе С, матчы адбудуцца ў Любляне. Сапернікамі падапечных Віктара Бекшы будуць гульцы Славеніі (12 верасня), Расіі (13 верасня), Фінляндыі (15 верасня), Паўночнай Македоніі (16 верасня) і Турцыі (17 верасня).

3. ***Гандбалісты юнацкай (U-17) зборнай Беларусі спыніліся за крок ад п'едэстала першынства Еўропы, якое завяршылася ў шведскім Гётэборгу.*** У паядынку за бронзавыя ўзнагароды наша зборная саступіла аднагодкам з Ісландыі — 29:30. Да матча за «бронзу» падапечныя Васіля Астроўскага атрымалі перамогі над гандбалістамі Бельгіі — 33:24, Польшчы — 32:27, Венгрыі — 31:24 і Фінляндыі — 36:22, саступіўшы сапернікам са Славакіі — 27:28, Іспаніі — 29:32 і Фарэрскіх астравоў — 21:32.

У фінальным матчы за чэмпіёнскі тытул Фарэры перайгралі шведаў з лікам 36:29.

4. ***Завяршыліся матчы 14-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Гульцы брэсцкага «Дынама» перамаглі на выездзе «Віцебск» 1:0 і захавалі лідарства ў турнірнай табліцы. Салігорскі «Шахцёр» на апошніх хвілінах у сябе дома вырваў валявую перамогу над футбалістамі «Мінска» — 3:2. Вынікі іншых сустрэч: «Энергетык-БДУ» — «Нёман» (Гродна) — 2:4, «Дынама» (Мінск) — БАТЭ (Барысаў) — 1:2, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Дняпро» (Магілёў) — 1:0, «Іслач» (Мінскі раён) — «Славія» (Мазыр) — 2:1, «Слуцк» — «Тарпеда» (Мінск) — 1:0, «Гомель» — «Гарадзея» — 0:0.

Становішча ў групе лідараў: «Дынама» (Брэст) — 36 ачкоў, БАТЭ — 34, «Шахцёр» — 31, «Тарпеда-БелАЗ» — 27, «Дынама» (Мінск) — 25.

5. ***Баскетбалісткі зборнай Іспаніі другі раз запар сталі пераможцамі чэмпіянату Еўропы.*** Як і два гады таму ў Празе, іспанкі ў фінале сустрэліся з камандай Францыі і дамагліся перамогі — 86:66. Гэта другі запар і чацвёрты ў гісторыі чэмпіёнскі тытул жаночай зборнай Іспаніі. Уладальніцамі бронзавых медалёў цяперашняга кантынентальнага першынства сталі гаспадыні вырашальнага этапу баскетбалісткі Сербіі, якія разграмілі ў матчы за 3-е месца каманду Вялікабрытаніі, — 81:55.

Нагадаем, зборная Беларусі другі раз запар выступіла на чэмпіянаце Еўропы няўдала. Як і ў Чэхіі-2017, падапечныя Наталлі Трафімавай не змаглі выйсці ў плэй-оф, заняўшы апошняе месца ў папярэдняй групе. Беларускі перамаглі бельгійскіх баскетбалістак (69:61), а таксама прайгралі сербкам (53:55) і расіянкам (62:76).

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

9 ЛІПЕНЯ

У краіне

1884 год — нарадзіўся Міхаіл Маркавіч Барадзін (Грузенберг), рэвалюцыянер, савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. У рэвалюцыйным руху з 1900 года. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. З 1907-га — у ЗША: член Сацыялістычнай партыі ЗША, Таварыства дапамогі рускім палітвязням. З 1918 года ў Наркамаце замежных спраў РСФСР і Камінтэрне, пасол РСФСР у Мексіцы (1919 год). З 1923 года галоўны палітычны саветнік ЦВК Гаміньдана ў Кітаі. З 1927 года ў СССР: намеснік наркама працы, намеснік дырэктара ТАСС. З 1932 года — галоўны рэдактар газеты Moscow News («Маскоўскія навіны»), адначасова ў 1941—1949 гадах рэдактар Саўінфармбюро. У 1951 годзе рэпрэсаваны, рэабілітаваны пасмяротна.

1914 год — нарадзіўся Уладзімір Фёдаравіч Уладзіміраў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944). У 1942 годзе скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. Камандзір роты 118-га гвардзейскага стралковага палка гвардыі лейтэнант Уладзіміраў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. У снежні 1943 года быў паранены і прапаў без вестак.

1929 год — нарадзіўся Алег Пятровіч Альхоўскі, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1943 годзе залічаны юнгам на ваеннае судна Волжскай флатыліі. Удзельнічаў у Бабруйскай аперацыі 1944-га. Загінуў у 1944 годзе пры вызваленні Пінска.

1944 год — нарадзілася Ніна Канстанцінаўна Залеўская, беларускі балетмайстар, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1971 годзе скончыла Ленінградскі інстытут культуры. У 1964—1966 гадах працавала ў Пружанскім Доме культуры. З 1970 года выкладае ў Гродзенскім каледжы мастацтваў, адначасова ў 1976—2002 гадах арганізатар і мастацкі кіраўнік народнага ансамбля «Праліца» Палаца культуры «Юнацтва», з 1998 года арганізатар і мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца «Гарадзенскія карункі».

1954 год — нарадзілася Святлана Рыгораўна Гарбунова, беларускі скульптар. У творах выкарыстоўвае абагульненую лаканічную трактоўку формаў, надае вобразам узвышанасць, паэтычнасць, рамантычна-эпічны настрой. Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Сярод работ: помнік С. Буднаму ў Нясвіжы, мемарыяльныя дошкі Ф. Скарыну ў Гомелі, А. Пушкіну, В. Чацверыкову, Герою Савецкага Саюза К. Шабану, надмагіллі К. Крапівы, В. Цвіркі, кампазіцыі «Марк Шагал», «Ефрасіння Полацкая», «Францыск Скарына».

У свеце

1819 год — нарадзіўся Эліяс Хоў, амерыканскі механік і прадпрымальнік, адзін з вынаходнікаў швейнай машынкі. Памёр у 1867 годзе.

1834 год — нарадзіўся Ян Неруда, чэшскі пісьменнік, паэт і журналіст, найбуйнейшы ў Чэхіі прадстаўнік крытычнага рэалізму. Памёр у 1891 годзе.

1887 год — англійскі фабрыкант Джон Дзікенсан на штогадовай сустрэчы вытворцаў паперы прадставіў на ўрачыстым абедзе першыя папяровыя сурвэткі.

1924 год — нарадзілася Муза Віктараўна Крапкагорская, расійская кінаактрыса, заслужаная артыстка РСФСР. Здымалася ў многіх фільмах, сярод якіх — «Маладая гвардыя», «Каханне зямное», «Масква слязам не верыць». Памерла ў 1999 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.49	21.40	16.51
Віцебск —	4.31	21.38	17.07
Магілёў —	4.39	21.30	16.51
Гомель —	4.45	21.18	16.33
Гродна —	5.06	21.53	16.47
Брэст —	5.16	21.45	16.29

Месяц

Першая квадра ў 13.54. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана.* ***К.*** *Веранікі, Зянона, Мікалая.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Убачыў знічку і загадаў, каб нам, кампаніі з чатырох хлопцаў, без праблем здалі кватэру. Знічка развярнулася і паляцела назад.

— Фіма, хопіць вытарашчвацца ў халадзільнік і закрый яго, нарэшце. Там лямпачка ўжо наматала больш, чым ты зарабляеш!

Маркетолагам, якія прыдумалі замест 1 літра малака прадаваць 950 мл, трэба замест 100 % заробку плаціць 95 %.

— Што агульнага паміж генеральным дырэктарам «Мерседэса» і генеральным дырэктарам «АўтаВАЗа»? Яны абодва ездзяць на «мерседэсах».



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2336. Нумар падпісаны ў 19.30 8 ліпеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12